# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, КНІГАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

*Т.В.КУЗЬМІНІЧ*

## БІБЛІЯТЭЧНЫ СЕГМЕНТ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ФАКТАГРАФІЧНЫХ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ: ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТ

*Разглядаюцца тэарэтычныя аспекты фактаграфічнай інфармацыі, асаблівасці фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў, якія стварае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Засяроджваецца ўвага на найбольш значных фактаграфічных базах даных: “Нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў”, “Вучоныя Беларусі”, “Беларусь у асобах і падзеях”. Азначаны асноўныя праблемы ў іх стварэнні, прапанаваны кірункі ўдасканалення ўключаных масіваў фактаграфічных запісаў, карпаратыўнага ўзаемадзеяння бібліятэк па развіцці гэтых баз даных.*

Інтэнсіўнасць развіцця камунікатыўных працэсаў у соцыуме, павелічэнне аб’ёмаў ствараемай і распаўсюджваемай інфармацыі актуалізуюць праблему яе якаснага згортвання, фарміравання другаснай інфармацыйнай прадукцыі, якая дазваляе выдзяляць галоўнае, сутнаснае з першасных тэкстаў, упарадкаваць самі тэксты, ствараць новыя навуковыя веды. Асабліва выразна гэта задача паўстае перад бібліятэкамі. Яны кумулююць аб’екты дакументнай спадчыны (нацыянальнай у тым ліку), іх паслугі запатрабаваны самымі шырокімі коламі грамадства, таму і ствараемая імі другасная інфармацыя павінна адпавядаць самаму высокаму ўзроўню. Неабходна адзначыць, што ў айчынных і замежных публікацыях разглядаецца, як правіла, толькі бібліяграфічная частка другаснай інфармацыйнай прадукцыі [6; 9; 10; 15]. Фактаграфічная застаецца практычна па-за ўвагай даследаванняў. У гэтым артыкуле засяродзім увагу на асаблівасцях сучаснай фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі, фарміруемай бібліятэкамі краіны. Для гэтага акрэслім зыходныя тэарэтычныя катэгорыі, якія маюць адносіны да фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі, разгледзім структуру фактаграфічнага запісу і прааналізуем сучасныя адпаведныя выданні і базы даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (далей – НББ).

У межах фіксаванай інфармацыі традыцыйна выдзяляюць першасны і другасны ўзроўні (блокі), у апошнім – фактаграфічную і бібліяграфічную часткі. Мяжа паміж першаснай і другаснай інфармацыяй, бібліяграфічнай і фактаграфічнай даволі ўмоўная. Гэта тлумачыцца асаблівасцей сучаснага прадстаўлення першасных тэкстаў, якія аснашчаюцца вялікімі пластамі бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, другасных дакументаў, якія могуць утрымліваць фрагменты першасных тэкстаў, а з пункту гледжання бібліяграфічнага адлюстравання тэкстаў як фактаў рэчаіснасці могуць разглядацца як уласна першасныя тэксты.

У сучасных умовах адбылося істотнае пашырэнне аб’ектнай сферы бібліяграфіі за кошт знакаграфіі, дакументаграфіі, медыяграфіі, відэааўдыяграфіі, фільмаграфіі, ідэаграфіі, сэнсаграфіі, інтэрнэтграфіі, сайтаграфіі. Яна ўвабрала ў сваю сферу ўвесь універсум крыніц ведаў (інфармацыі) [21, с.126]. Акрамя таго, пашырыліся яе магчымасці пранікнення ў тэкст, прадстаўлення яго на ўзроўні фрагмента, кванта ведаў. Адпаведна павялічылася яе навуковая састаўляючая і больш выразна стала праяўляцца яе “фактаграфічнасць”. Бібліяграфічная інфармацыя з’яўляецца неад’емнай для большасці відаў баз даных: бібліяграфічных, рэфератыўных, паўнатэкставых, канцэптаграфічных,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія ўтрымліваюць элементы, ідэнтыфікуючыя канкрэтны тэкст, фрагменты тэксту ці вынікі яго аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі, магчымы таксама ў фактаграфічных, графічных, мультымедыйных, якія змяшчаюць канкрэтныя факты, прыкметы, паказчыкі, схемы, малюнкі, ілюстрацыі, відэа- і аўдыяматэрыялы, якія часцей за ўсё маюць бібліяграфічнае аснашчэнне, што дазваляе ідэнтыфікаваць канкрэтны тэкст, факт і суаднесці іх з канкрэтным дакументам. Таму пры разглядзе фактаграфічнага сегмента нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў магчыма ўключэнне ў яго і бібліяграфічнага кампанента як асобага праяўлення фактаграфіі і часткі нацыянальнай дакументаванай інфармацыйнай спадчыны, якая адлюстроўвае вынікі вытворчай і творчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў пэўны гістарычны перыяд.

Бібліятэкі (НББ у прыватнасці) традыцыйна ствараюць інфармацыйна-пошукавыя сістэмы і даволі разнастайную іншую адасобленую ад фонду бібліяграфічную прадукцыю. Сёння прыярытэты аддаюцца развіццю электронных формаў прадстаўлення бібліяграфічнай інфармацыі. Гэта дазваляе, з аднаго боку, павялічыць яе колькасць, сабраць вялікія масівы запісаў і стварыць для карыстальніка аптымальна зручны інфармацыйна-пошукавы рэжым, з другога – спалучыць і прапанаваць карыстальніку ў розных камбінацыях бібліяграфічную, фактаграфічную і першасную інфармацыю.

Фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі незалежна ад формаў яе існавання і аб’ектаў адлюстравання характэрны наступныя рысы: аднатыпнасць і строгая ўпарадкаванасць элементаў (запісаў), хуткасць пошуку інфармацыі і фрагментарнасць (выбарачнасць) яе чытання, дакладнасць уключаемых звестак, аператыўнасць іх папаўнення (пры неабходнасці карэкціроўка, замена), адсутнасць фактaлагічнага аналізу і аўтарскай інтэрпрэтацыі ў апісанні аб’ектаў адлюстравання.

Асноўным элементам фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі з’яўляецца апісанне факта. У моўных слоўніках факт тлумачыцца як “нявыдуманы, сапраўдны выпадак, падзея, тое, што адбылося на самай справе” [4, с.889; 18, с.705], ці крыху шырэй – “ісціна, нявыдуманы выпадак, падзея, з’ява; цвёрда ўстаноўленая падстава, на якой будуецца тэорыя; веды, сапраўднасць якіх даказана” [14, с.832], а “фактаграфія – апісанне фактаў без усякага аналізу і абагульнення” [18, с.705].

Аб’ёмы паняцця “фактаграфічная інфармацыя” яшчэ больш разыходзяцца ў розных крыніцах: ад вельмі вузкіх (“інфармацыя, якая характарызуе які-небудзь канкрэтны факт, фактычную падзею ці іх сукупнасць”) [2, с.127; 20, с.249] да даволі шырокіх (“звесткі (даныя) у выглядзе канкрэтных фактаў, паказчыкаў, характарыстык, рэквізітаў і да т.п., атрыманыя ў выніку аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў непасрэдна ад суб’екта – стваральніка фактаграфічнай інфармацыі (спецыяліста) ці ад тэхнічнага абсталявання (камп’ютара, вымяральнай сістэмы і да т.п.”) [1, с.1085]. У першым азначэнні, на наш погляд, абмежавана разнастайнасць з’яў, падзей, характарыстык, якасцей, якія можна аднатыпна сфармуляваць (апісаць), спалучыць і ўпарадкаваць толькі фактамі-падзеямі (што такое канкрэтны факт – незразумела). У другім даволі поўна падаецца пералік аб’ектаў адлюстравання, але ў якасці крыніцы атрымання ўказаны толькі дакумент. За межамі азначэння застаецца вялікая частка фактаў-падзей, якія могуць упершыню фіксавацца і абнародавацца менавіта праз крыніцы фактаграфічнай інфармацыі.

Яшчэ складаней з тэрмінамі, якія тычацца фактаграфічнай прадукцыі. Напрыклад, фактаграфічная база даных называецца базай першасных даных і азначаецца як “база, якая змяшчае інфармацыю, што адносіцца непасрэдна да прадметнай галіны” [16, с.3; 20, с.29; 17, с.362], ці база даных, “якая ўтрымлівае фактаграфічныя (у тым ліку даведачныя) даныя” [3, с.150]. У якасці сутнасных характарыстык вызначаюцца забеспячэнне і апрацоўка інфармацыі аб канкрэтных фактах ці з’явах (у структураваным выглядзе падобны на табліцы) [19, с.82]. Такія азначэнні надзвычай недасканалыя, іх немагчыма суаднесці з вышэйпрыведзенымі трактоўкамі тэрмінаў “факт”, “фактаграфічная інфармацыя”, якія з’яўляюцца зыходнымі для разгляду ўсіх з’яў фактаграфічнага характару.

Удакладненне ўзгаданых і іншых звязаных з імі тэрмінаў патрабуе асобнага разгляду. На нашу думку, бібліятэчны сегмент фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі магчыма аналізаваць, абапіраючыся толькі на найбольш шырокае разуменне аб’ёму паняццяў “факт” і “фактаграфічная інфармацыя”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура фактаграфічнага запісу як фіксаванай формы фактаграфічных звестак (паведамлення) можа быць рознаўзроўневай, абавязкова ўключаць фактаграфічнае апісанне і, магчыма, аснашчацца іншымі нефактаграфічнымі матэрыяламі.

*Структура фактаграфічнага запісу*

| Узровень | Элементы запісу |
|---|---|
| Адзін (аднаўзроўневы запіс) | Фактаграфічныя апісанні (апісанні падзей, асоб, устаноў, геаграфічных, іншых аб'ектаў) |
| Два (двухузроўневы запіс) | Фактаграфічныя і бібліяграфічныя апісанні (апісанні падзей, асоб, устаноў, геаграфічных, іншых аб'ектаў суправаджаюцца спасылкамі на крыніцы іх выяўлення) |
| Тры і больш (шматузроўневы запіс) | Фактаграфічныя, бібліяграфічныя апісанні, графічныя, тэкставыя і іншыя матэрыялы (апісанні падзей, асоб, устаноў, геаграфічных, іншых аб'ектаў суправаджаюцца спасылкамі на крыніцы выяўлення матэрыялу з уключэннем фрагмента гэтай крыніцы, ілюстрацый, поўнага тэксту крыніцы ці іншага дакумента, які звязаны з аб'ектам фактаграфічнага адлюстравання фармальна ці змястоўна) |

Найбольш распаўсюджана аднаўзроўневая структура фактаграфічнага запісу. Яна часта прымяняецца ў навуковых, вучэбных працах па гісторыі (так званыя хронікі падзей), пры стварэнні разнастайных пералікаў лексічных адзінак, геаграфічных і іншых найменняў, аўтараў. У дакументнай прадукцыі бібліятэк (у большасці сваёй – друкаванай) такая фактаграфічная інфармацыя прысутнічае, падаецца як частка асноўнага тэксту, метадычнага апарату выдання. Напрыклад, у манаграфіі, выдадзенай да 85-годдзя НББ, у якасці аднаго з дадаткаў змешчана "Хроника строительства", у межах якой разглядаюцца асноўныя этапы будаўніцтва новага будынка НББ, а таксама (фрагментарна) падрыхтоўка да пераезду і перамяшчэнне асноўных грузаў [11]. Асноўныя тэксты зборнікаў (неперыядычных, прадаўжальных) [напрыклад, 5; 8 і інш.], як правіла, суправаджаюцца фактаграфічнай інфармацыяй аб аўтарах (прозвішча, імя, імя па бацьку, месца працы і пасада), якая, нягледзячы на лаканічнасць, дазваляе ідэнтыфікаваць кожнага з аўтарскага калектыву. Былі спробы стварыць несамастойныя выдавецкія формы хронік і з больш складанай структурай запісу. Да бібліяграфічнага паказальніка "Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 1922–1992" (Мн., 1992) у якасці дадатку ўключана "Хроніка дзейнасці бібліятэкі. 1922–1992", у якой з пачатку зацвярджэння Пастановы аб стварэнні адзінай Беларускай дзяржаўнай і ўніверсітэцкай бібліятэкі і да 1990 г. падаюцца асноўныя падзеі гісторыі ўстановы з адсылкамі да крыніц апублікавання ці адлюстравання ў архіўных дакументах [13]. Хронікі фіксуюць факты без аўтарскай інтэрпрэтацыі, паказваюць развіццё падзей у часе. Карыстальнік праз гэтыя выданні атрымлівае дакладную і лаканічную інфармацыю аб пэўнай падзеі, эмпірычны матэрыял для напісання гістарычных прац, розных па жанры, узроўні абагульнення інфармацыі. Спасылкі на архіўныя фонды, крыніцы выяўлення пэўнага факта падкрэсліваюць рэальнасць яго існавання, а карыстальнік адсылаецца да крыніц фіксавання факта, што спрыяе пашырэнню дакументальнай базы даследаванняў.

Трэба сказаць, што ў айчынным дакументным патоку хронікі прадстаўлены не толькі раздзеламі, дадаткамі да энцыклапедычных даведнікаў, навуковых і іншых дакументаў, але і самастойнымі выданнямі рэтраспектыўнымі (неперыядычнымі) і бягучымі (перыядычнымі). Апошнія – даволі рэдкая з'ява. Іх падрыхтоўка звязана з пастаянным адсочваннем развіцця пэўнай прадметнай галіны, зборам эмпірычнага матэрыялу, яго аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкай і падачай па пэўных жанравых патрабаваннях. З 1980 г. аддзелам навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве НББ пачала ствараца хроніка падзей "Культурнае жыццё Беларусі" (пазнейшая назва "Хроніка культурнага жыцця"). Зараз яна мае несамастойную (унутрычасопісную) форму і змяшчаецца ў выданні "Аператыўная інфармацыя па культуры і мастацтве". Фактаграфічны матэрыял гэтай хронікі дае карыстальніку магчымасць хутка выявіць назвы, даты і кароткія апісанні фестываляў, канферэнцый, выстаў, канцэртаў, прэм'ер і іншых мерапрыемстваў без звяртання да вялікай колькасці газет, часопісаў, справаздач і да т.п., часам недаступных яму па шэрагу прычын. Выданне выконвае не толькі функцыю кумуліравання бягучых падзей у культурным жыцці краіны, але і спрыяе паскарэнню правядзення навуковых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаванняў, робіць пэўны ўнёсак у стварэнне іх фактаграфічнай базы. Гэта адпаведна ўскладае вялікую долю адказнасці на стваральнікаў хронік за дакладнасць, аб’ектыўнасць і паўнату адлюстравання інфармацыі, асабліва калі не падаецца ў межах запісу крыніца надрукавання факта. Трэба сказаць, што пошукавыя магчымасці гэтых выданняў даволі абмежаваныя (гэта характэрная рыса большасці друкаваных хронік): тэрмін стварэння самога выдання, час пэўнай падзеі.

Значна большыя магчымасці па пераліку аб’ектаў адлюстравання, іх колькасці, кірунках пошуку інфармацыі маюць фактаграфічныя базы даных, напрыклад “Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і замежных краін”[1]. У ёй сабраны звесткі аб бібліятэках рознага ведамаснага падпарадкавання, розных краін свету (даюцца іх назвы, ведамасная і відавая прыналежнасць, структура, адрас і іншая кантактная інфармацыя, рэжым працы, інфармацыйныя рэсурсы і да т.п.). Названы і ахарактарызаваны больш за 7 тыс. бібліятэк Беларусі, амаль 80 замежных бібліятэк з 55 краін свету. Запісы аднатыпныя, але часам па напаўненні розныя: ад самых поўных – з запаўненнем усіх прадугледжаных фарматам запісаў палёў, да кароткіх – з прадастаўленнем толькі асноўных ідэнтыфікуючых арганізацыю звестак. Гэта абумоўлена магчымасцямі выкарыстання той ці іншай крыніцы інфармацыі: анкеты, якую запоўніла бібліятэка, сайта бібліятэкі і яго інфармацыйнага напаўнення. Трэба адзначыць даведачныя магчымасці не толькі асобных запісаў, але і структурных элементаў больш высокага ўзроўню: ведамаснае падпарадкаванне бібліятэкі, тэрытарыяльнае размяшчэнне, уключэнне ў пэўную бібліятэчную сетку. Пошук інфармацыі аб бібліятэках магчымы па назве, адрасе, ведамасным падпарадкаванні, рэгіёне, тыпавідавых прыкметах. Асобна даюцца персаналіі і звесткі пра электронныя інфармацыйныя рэсурсы. Ад персаналіі магчымы выхад на блок інфармацыі аб бібліятэцы. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы прадстаўлены пералікам баз даных з магчымасцю ўстанаўлення сувязей з бібліятэкамі, у якіх яны ёсць, магчымасцямі пошуку па назве, стваральніку, уладальніку, галіне ведаў і інш. Гэта дазваляе не толькі годна прадставіць кожную бібліятэку, але і атрымаць уяўленне аб інфармацыйным забеспячэнні гэтымі рэсурсамі бібліятэк Беларусі ў цэлым ці выбранай па пэўнай прыкмеце сукупнасці (напрыклад, ведамаснае падпарадкаванне). Але трэба адзначыць, што гэтая база даных знаходзіцца на этапе станаўлення і таму неабходна пашырэнне асобных блокаў фактаграфічнай інфармацыі, удасканаленне алгарытмаў яе абнаўлення.

Больш разнастайную па пераліку аб’ектаў апісання інфармацыю дае база даных “Беларусь у асобах і падзеях”[1]. Яна змяшчае фактаграфічныя звесткі аб асобах, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё нашай краіны, найбольш важных падзеях яе гісторыі, арганізацыях, прадпрыемствах, установах, перыядычных выданнях, помніках гісторыі і культуры і іншых аб’ектах. Прычым кожны з аб’ектаў адлюстравання ўсебакова характарызуецца. Напрыклад, у звестках аб пэўнай персоне ўказваюцца ўсе выяўленыя варыянты імён на беларускай, рускай і замежных мовах, псеўданімы, крыптонімы, духоўныя ці свецкія імёны, даты жыцця, месца нараджэння, род дзейнасці, прэміі, званні, а таксама прыводзяцца назвы тэрыторый, з якімі звязаны яе жыццё і/ці дзейнасць. Інфармацыя аб падзеях уключае не толькі назву гэтай падзеі на беларускай, рускай і іншых мовах, але і называюцца асноўныя даты, месцы падзей і іх асноўныя ўдзельнікі. Да таго ж частка запісаў уключае бібліяграфічныя спасылкі на крыніцы выяўлення фактаў. На аснове названай базы даных ствараецца фактаграфічная электронная (інтэрнэт-варыянт, CD-ROM) і друкаваная (дадатак да выдання “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”) прадукцыя бягучага характару – “Беларускі каляндар, … год”. Гэта толькі невялікія храналагічныя зрэзы інфармацыі. Аб’ёмы і пошукавыя магчымасці самой базы даных значна шырэйшыя.

З канца 2006 г. здзяйсняліся распрацоўка новага праграмнага забеспячэння на праграмна-тэхнічных сродках КІТС НББ з выкарыстаннем СУБД ORACLE 10g, а затым канвертаванне назапашанага масіву (20 000 запісаў), карэкціроўка і некаторая дапрацоўка. У выніку пашырыліся функцыянальныя магчымасці базы, стаў больш сучасным інтэрфейс, далучаны да фактаграфічных запісаў графічныя вобразы розных аб’ектаў. Чытач

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Ствараецца НББ з 2007 г. http://interlib.nlb.by/bb/index/index.php.

[1] Фарміруецца з 1997 г. у аперацыйнай сістэме MS DOS з выкарыстаннем праграмнага асяроддзя xBase.

атрымаў магчымасць доступу (у тым ліку і аддаленага) да шматузроўневых фактаграфічных запісаў беларусазнаўчага характару, створаных на аснове самых аўтарытэтных крыніц, пастаянна абнаўляемых. Па сутнасці сваёй гэта краіназнаўчы даведнік са значным спектрам аб'ектаў адлюстравання.

Уся вышэйразгледжаная і іншая аналагічная інфармацыйная прадукцыя, ствараемая НББ і іншымі бібліятэкамі краіны, безумоўна, удзельнічае ў фарміраванні фактаграфічнага сегмента нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў, спрыяе ўпарадкаванню эмпірычных даных, пашырэнню і паляпшэнню доступу да іх карыстальнікаў. Але яна не валодае "ўнікальна бібліятэчнымі" характарыстыкамі, якія ўласцівы базам даных аўтарытэтных запісаў і аб якіх размова пойдзе ніжэй.

Фарміраванне аўтарытэтных/нарматыўных запісаў у НББ пачалося ў 1998 г. на базе раней створаных масіваў бібліяграфічных запісаў, канвертавання машынных слоўнікаў ключавых слоў у структуру аўтарытэтных файлаў. У 2001–2005 гг. спачатку па дамове паміж НББ і Фондам інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, пазней у межах дзяржаўнай праграмы "Электронная Беларусь" была выканана навуковая тэма "Разработать проект и создать национальные базы данных авторитетных записей (авторы, предметные рубрики и т.д.)". Узровень вынікаў распрацоўкі адпавядаў сусветным патрабаванням да падобных прац. Былі ахоплены ўсе прадугледжаныя міжнародным фарматам UNIMARC/A тыпы аб'ектаў (энтытэтаў) аўтарытэтнага кантролю[2]. Створана праграмнае забеспячэнне, распрацаваны фармат [12], якія дазваляюць на сусветным узроўні ствараць аўтарытэтныя запісы, абменьвацца імі з любой сучаснай інфармацыйнай сістэмай, а таксама іншая неабходная метадычная дакументацыя для рэалізацыі работ у бягучым рэжыме. Быў сфарміраваны вопытны масіў аўтарытэтных запісаў на імёны асоб, назвы калектываў, радавыя імёны, геаграфічныя назвы, тэматычны прадмет, уніфікаваную назву і іншыя тыпы аб'ектаў.

Гэты масіў стаў часткай нацыянальнай базы даных аўтарытэтных запісаў, якая непарыўна звязана з запісамі электроннага каталога НББ і запісамі зводнага электроннага каталога[3]. З пераходам на новае праграмнае забеспячэнне НББ атрымала магчымасць весці названую базу ў рэжыме бягучай каталагізацыі і выпраўляць адначасова рэтраспектыўны масіў. Сёння ствараюцца аўтарытэтныя запісы на 11 найменняў аб'ектаў. Агульная колькасць аўтарытэтных запісаў у БД (на 01.10.2010) складае больш за 220 000[4]. Гэта фактаграфічны масіў, які дазваляе не толькі апісаць пэўныя аб'екты (нацыянальныя з асаблівай увагай і глыбінёй), але і ўстанавіць сувязі паміж дакументамі, у якіх яны адлюстраваны.

Аўтарытэтныя запісы ствараюцца на падставе канкрэтнага дакумента да бібліяграфічных запісаў электроннага каталога і, зразумела, утрымліваюць лаканічныя, а часам і мінімальныя звесткі даведачнага характару. Масіў у цэлым знаходзіцца ў рэжыме пастаяннай карэкціроўкі. Ён змяшчае аўтарытэтныя запісы (з папярэдняй і ўстаноўленай формамі загалоўка) і прататыпы; аўтарытэтныя запісы поўныя і частковыя; даведачныя запісы і спасылачныя; асноўныя і варыянтныя формы загалоўкаў. У гэтым сэнсе ён адрозніваецца ад універсальных даведачных выданняў. Але ёсць шэраг пераваг: вялікая і пастаянна папаўняемая крыніцазнаўчая база; сувязь з канкрэтным дакументам, па фармальных ці змястоўных характарыстыках якога ствараецца аўтарытэтны запіс; сувязь аб'екта з пэўным сегментам рэтраспектыўнага масіву, выдзяляемага па гэтым аб'екце; уключэнне дакладнага пераліку аб'ектаў адлюстравання; шматаб'ектнасць адлюстравання; устаноўленыя сувязі паміж загалоўкамі, паняццямі розных узроўняў; падмацаванне фармулёвак інфармацыяй са слоўнікаў, даведнікаў, энцыклапедый і інш.; удакладненне

---

[2] У такіх аб'ёмах працы па аўтарытэтным кантролі праводзіліся ўпершыню на тэрыторыі СНД і іншых краін былога СССР.

[3] Зараз здзяйсняецца абнаўленне сукупнага масіву запісаў НББ, РНТБ і ЦНБ для рэалізацыі працы па карпаратыўнай каталагізацыі і сінхронным папаўненні зводнага электроннага каталога.

[4] Назвы калектываў – больш за 21 700 запісаў, прадметаў – больш за 93 260, імён асоб – больш за 80 460, геаграфічныя назвы – больш за 15 000, гандлёвыя маркі – 818, радавыя імёны – 337, уніфікаваныя загалоўкі – 1493, імёны/загалоўкі – 2599, імёны/абагульняючыя загалоўкі – 16, месца выдання – 1240, форма, жанр або фізічныя характарыстыкі дакумента – больш за 4150.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ектаў, якія яшчэ не адлюстраваны ў даведачных выданнях (новых навуковых тэрмінаў, асоб, калектываў і да т.п.); строга вытрыманая структура аднапарадкавых запісаў (адпаведна фармату і метадычным рэкамендацыям па яго прымяненні).

Падобныя базы даных не толькі выконваюць утылітарную функцыю забеспячэння эфектыўнасці інфармацыйнага пошуку ў вялікіх па памеры электронных каталогах бібліятэк, архіваў, музеяў, але і з'яўляюцца адной з формаў захавання культурнай спадчыны народаў, таму што адносяцца да той разнавіднасці ўніверсальных даведачных выданняў (энцыклапедый, тлумачальных слоўнікаў і тэзаўрусаў, даведачных БД), без якіх немагчыма сучасная цывілізацыя [7]. Аўтарытэтныя запісы ствараюцца да бібліяграфічных запісаў на аснове аналізу значнай колькасці крыніц фіксаванай інфармацыі, найперш фактаграфічных, неабходных для выяўлення і пацвярджэння звестак аб пэўным аб'екце. Часам прыходзіцца ідэнтыфікаваць не апісаны і не ўпамінаемы ў іншых крыніцах (акрамя дакумента, да якога ствараецца аўтарытэтны запіс) аб'ект. У гэтым выпадку ствараецца новая фактаграфічная інфармацыя аб аб'екце, які ўжо заяўлены праз дакументны паток, але яшчэ адсутнічае ў энцыклапедыях, даведніках, слоўніках. Ствараецца яна сінхронна з бібліяграфічным адлюстраваннем дакумента, у якім апісаны пэўны аб'ект.

Разам з тым бібліятэка сутыкаецца з праблемамі пошуку інфармацыі для ідэнтыфікацыі і дадатковага апісання такога аб'екта. Гэта складаная праблема, якая часам вымушае абмяжоўваць падачу інфармацыі толькі адным загалоўкам ці зусім кароткімі звесткамі і потым неаднаразова звяртацца да яе. Асабліва яна абвастраецца пры стварэнні аўтарытэтных запісаў на імя асобы (аўтара тэксту, часам, персаналіі), калі неабходна даваць звесткі не столькі аб вельмі вядомых, колькі аб новых для дакументнага патоку асобах. Да таго ж у нашай айчыннай інфармацыйнай прадукцыі амаль адсутнічаюць галіновыя энцыклапедыі і біяграфічныя слоўнікі, якія даюць магчымасць пашыраць спектр персаналій у параўнанні з адпаведнымі ўніверсальнымі выданнямі. Перад бібліятэкамі паўстае пытанне пошуку аўтарытэтных крыніц фактаграфічнай інфармацыі, якія б амаль сінхронна з выхадам дакумента ў свет давалі звесткі аб новых персонах ці зменах у дзейнасці ўжо вядомых. На наш погляд, знойдзены добры алгарытм фарміравання такога даведачнага масіву і адначасова стварэння цікавага інфармацыйнага прадукту, які па плануемым аб'ёме і падыходах не мае аналагаў у айчыннай бібліятэчнай практыцы.

У канцы 2008 г. НББ выступіла з ініцыятывай карпаратыўнага фарміравання фактаграфічнай базы даных "Вучоныя Беларусі". Галоўнымі стваральнікамі яе павінны стаць напачатку НББ, бібліятэкі вышэйшых навучальных устаноў, у перспектыве – рэспубліканскія і абласныя бібліятэкі. На сённяшні дзень дамовы аб сумеснай працы падпісаны НББ з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам, Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам. Бібліятэкам прапанаваны праграмнае забеспячэнне, методыка збору эмпірычных даных, тэхналогія працы па стварэнні фактаграфічных запісаў. Плануецца аператыўна адлюстроўваць у рэжыме стварэння аўтарытэтнага запісу звесткі персанальнага характару аб беларускіх навукоўцах, якія працуюць у вышэйшых навучальных установах (ВНУ) краіны.

Пакуль па-за межамі адлюстравання ў БД застаецца фактаграфічная інфармацыя аб беларускіх навукоўцах, якія працуюць не толькі ў іншых ВНУ, але і ў навукова-даследчых, вытворчых установах. Прычым часткова яна ствараецца бібліятэкамі ці для сваіх лакальных інфармацыйных прадуктаў, ці, напрыклад, як РНМБ, удзельнічаюць у стварэнні замежных баз даных. На сучасным этапе ўсё ахапіць немагчыма. Зараз ідзе апрабіраванне выпрацаванага (найбольш аптымальнага) алгарытму работы з выкарыстаннем аднаго праграмнага забеспячэння, удасканаленне інтэрфейсу і пошукавых магчымасцей, падыходаў да адміністравання і вырашэння арганізацыйных пытанняў, кірункаў і ўмоў далучэння да праекта іншых бібліятэк і да т.п. Развіццё БД павінна здзяйсняцца за кошт не толькі далучэння новых удзельнікаў, пашырэння аб'ектаў адлюстравання, але і ўзмацнення сувязей масіву з нацыянальнай базай даных аўтарытэтных запісаў, ускладнення структуры запісу (у перспектыве да фактаграфічных звестак будуць далучацца бібліяграфічныя, магчыма, графічныя і паўнатэкставыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыялы), сінхранізацыі адлюстравання звестак з навуковымі публікацыямі той ці іншай асобы, бібліяграфічнымі запісамі ў лакальных электронных каталогах і зводным электронным каталозе ў асяроддзі СУБД ORACLE 9і з сеткавым інтэрфейсам аддаленага інтэрнэт-доступу. Рэалізацыя падобнага праекта дазволіць ствараць арыгінальны нацыянальны інфармацыйны рэсурс, аператыўна ўносіць карэктывы ў яго і нацыянальную базу даных аўтарытэтных запісаў, забяспечыць дакладнасць апісання аб'ектаў, комплекснасць прадстаўлення інфармацыі, рэалізаваць адзіныя метадычныя падыходы да стварэння фактаграфічнай інфармацыі, апрабіраваць спецыялістамі бібліятэк-удзельніц стварэнне аўтарытэтных запісаў.

Такім чынам, у сучаснай тэрмінасістэме адсутнічае адзінства падыходаў да азначэння паняццяў "факт", "фактаграфічная інфармацыя", тэрмінаў, суадносных з адпаведнай інфармацыйнай прадукцыяй. Мы лічым, што разгляд бібліятэчнага сегмента фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі мэтазгодны, толькі абапіраючыся на найбольш шырокае разуменне аб'ёму паняццяў "факт" і "фактаграфічная інфармацыя", пад якія падпадаюць апісанні падзей, паказчыкаў, характарыстык, рэквізітаў, асоб, з'яў і да т.п., атрыманыя не толькі ў выніку аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі першасных дакументаў, але і непасрэдна ад суб'екта (суб'ектам), працы тэхнічнага абсталявання.

Бібліятэчны сегмент фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі даволі разнастайны: ад складання традыцыйных для выдавецкай прадукцыі фактаграфічных дадаткаў (аднаўзроўневых пералікаў падзей, асоб, тэрмінаў) да стварэння шматузроўневых аператыўна абнаўляемых электронных інфармацыйных рэсурсаў энцыклапедычнага характару. Сярод прадукцыі НББ найбольш цікавымі ўяўляюцца тры ўзаемазвязаныя паміж сабой базы даных: "Беларусь у асобах і падзеях", "Нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў", "Вучоныя Беларусі". Іх развіццё дазволіць пастаянна фарміраваць аператыўна абнаўляемы ўніверсальны беларусазнаўчы фактаграфічны масіў з шырокім спектрам аб'ектаў адлюстравання і разнастайнымі сувязямі з крыніцамі першаснай інфармацыі, асобнымі блокамі інфармацыі, прадстаўляць звесткі персанальнага і падзейнага характару, забяспечыць іх сінхранізацыю адпаведна зменам у дакументным патоку. На іх фактаграфічнай аснове ў перспектыве магчыма ствараць паўнатэкставыя рэсурсы адкрытага доступу.

Фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі, ствараемай НББ і іншымі бібліятэкамі краіны, уласцівы пашырэнне відавога і змястоўна-аб'ектнага спектра, паглыбленне сувязей з бібліяграфічнай і паўнатэкставай інфармацыйнай прадукцыяй, набыццё "ўнікальна бібліятэчных" характарыстык. Яна арганічна ўваходзіць у склад нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў.

---

1. *Библиотечная* энциклопедия / Рос. гос. б-ка; редкол.: Ю.А.Гриханов (гл. ред.) [и др.]. – М.: Пашков дом, 2007. – 1299 с.: ил., цв. ил., портр., табл.

2. *Библиотечное* дело: терминол. слов. / Рос. гос. б-ка; сост.: Т.А.Бахтурина [и др.]. – 3-е изд., знач. перераб. и доп. – М.: РГБ, 1997. – 167 с.

3. *Воройский, В.С.* Информатика: введение в современные информационные и телекоммуникационные технологии в терминах и фактах: энциклопедический словарь-справочник / В.С.Воройский. – М.: Физматлит, 2006. – 767 с.

4. *Ефремова, Т.Ф.* Новый словарь русского языка: толково-словообразовательный: свыше 136 000 слов. ст.; около 250 000семант. единиц: в 2 т. / Т.Ф.Ефремова. – 2-е изд., стер. – М.: Рус. яз., 2001. – Т. 2: П–Я. – 1088 с.

5. *Здабыткі*: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мн., 1995. – Вып. 9. – С. 25–39.

6. *Зеленевская, Н.П.* Тенденции формирования информационно-поисковых систем Национальной библиотеки Беларуси на современном этапе / Н.П.Зеленевская, Т.В.Кузьминич // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры, образования и бизнеса: тр. XII Междунар. Крымской конф. (Судак, Украина, 4–12 июня 2005 г.) [Электронный ресурс].

7. *Ильина, С.В.* Национальные особенности корпоративной базы данных авторитетных/нормативных записей библиотек Беларуси / С.В.Ильина, Л.Л.Бушило // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

образования и бизнеса: XV Междунар. конф. “Крым-2008” [Электронный ресурс]: доклады (Судак, Украина, 7–15 июня 2008 г.).

8. *Інфармацыйныя* рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: праблемы фарміравання і выкарыстання: зб. арт. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад. Т.В.Кузьмініч; рэдкал.: Л.Г.Кірухіна [і інш.]. – Мінск: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2008. – 202 с.: іл., табл.

9. *Кузьминич, Т.В.* Национальная библиотека Беларуси – центр библиографии по отечественной истории / Т.В.Кузьминич // Вестник Библиотечной Ассамблеи Евразии. – 2004. – № 4. – С. 72–76.

10. *Кузьминич, Т.В.* Перспективы развития информационных ресурсов Национальной библиотеки Беларуси в условиях формирования республиканского информационного центра / Т.В.Кузьминич // Парк высоких технологий – путь в интеллектуальное мировое сообщество: докл. IV Междунар. конгресса “Развитие информатизации и системы научно-технической информации в Республике Беларусь: парк высоких технологий – путь в интеллектуальное мировое сообщество” (Минск, 10–11 ноября 2004 г.). – Минск, 2004. – С. 189–191.

11. *Национальная* библиотека Беларуси: новое здание – новая концепция развития. – Минск, 2007. – С. 117–167; С. 289–294. – (К 85-летию Национальной библиотеки Беларуси).

12. *Национальные* коммуникативные форматы BELMARC для библиографических и авторитетных данных [Электронный ресурс]: метод. материалы / Национальная библиотека Беларуси; С.В.Ильина, А.В.Муравьева (отв. исполнители) [и др.]. – Минск: НББ, 2006. – 1 электронный оптический диск (CD-ROM); 12 см. Системные требования: Intel Pentium II/RAM 64/SVGA; Windows 98. – Заглавие с титульного экрана.

13. *Нацыянальная* бібліятэка Беларусі, 1922–1992: да 70-годдзя з дня заснавання і 100-годдзя з дня нараджэння першага дырэктара І.Б.Сіманоўскага: бібліягр. паказ. – Мінск, 1992. – С. 191–220.

14. *Новейший* словарь иностранных слов и выражений: [более 25 000 слов. ст.; свыше 100 000 иностранных слов и выражений]. – Минск: Современный литератор, 2007. – 975 с.

15. *Предеина, А.В.* Информационные ресурсы Национальной библиотеки Беларуси по экологии / А.В.Предеина // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры, образования и бизнеса: тр. XIII Междунар. Крымской конф. (Судак, Украина, 2006) [Электронный ресурс].

16. *Пошук* і распаўсюджванне інфармацыі. Тэрміны і азначэнні = Поиск и распространение информации. Термины и определения: СТБ 7.73–2002. – Мінск: Дзяржстандарт, 2002. – IV, 10 с. – (Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе = Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Дзяржаўны стандарт Рэспублікі Беларусь).

17. *Справочник* библиографа / Е.Н.Буринская [и др.]; науч. ред.: А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб.: Профессия, 2002. – 527 с. – (Серия “Библиотека”).

18. *Тлумачальны* слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / І.М.Бунчук, М.Н.Крыўко, З.М.Кудрэйка [і інш.]; пад. рэд. М.Р.Судніка, М.Н.Крыўко; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа. – 3-е выд. – Мінск: Бел. энцыкл., 2002. – 783 с.

19. *Трофимов, О.И.* О правовой охране баз данных / О.И.Трофимов, А.И.Горев // Государство и право. – 2008. – № 6. – С. 79–87.

20. *Фокеев,* В.А. Библиографическая наука и практика: терминол. словарь / В.А.Фокеев. – СПб.: Профессия, 2008. – 269, [1] с.

21. *Фокеев,* В.А. Постпрото(нео)библиография в контексте бархатной революции библиографии, развития новых информационных технологий, постмодернизма и постнеклассики / В.А.Фокеев // Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий: сб. ст. – М., 2007. – С. 122–129.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*T.KUZMINICH*

**LIBRARY SEGMENT OF THE NATIONAL FACTUAL INFORMATION RESOURCES:THEORETICAL AND METHODICAL ASPECT**

The theoretical aspects of factual information, characteristic of the factual information resources formed by the National Library of Belarus are reviewed. Attention is concentrated on the most significant factual databases: “The National Database of Authoritative Records”, “Scientists of Belarus”, “Belarus in Persons and Events”. The basic problems of their formation are defined. Improvement trends of the included factual records and library cooperation in the development of these databases are proposed.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ